№ 17 (46) Нядзеля 29-га траўня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адрадж[...]ньне — Тэрытарыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія. — Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырокі дэмократызм. — Ба[...] [...]ьная царква. — Краевая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на [...]
„ „ „ [...]
Заграніцу ўд[...]

[...]ы і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
[...]чынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

Конфэрэнцыя Прадстаўнікоў Бел. Нац. Рады Наваградчыны, Віленшчыны і Гарадзеншчыны.

ПРЫВІТАНЬНЯ.

У дню 22 траўня гэтага году ў памешканьні уласным Беларускай Хаткі ў Вільні (Завальная, 6) адбылася конфэрэнцыя прадстаўнікаў паасобных лёкальных групаў Беларускай Нацыянальнай Рады з паветаў Навагрудчыны, Віленшчыны і Горадзеншчыны.

Прысутных на конфэрэнцыі сяброў і прыхільнікаў Рады было 80 асобаў. Адчыніў Конфэрэнцыю Старшына Б. Н Р. п. А. Паўлюкевіч, які запрапанаваў выслаць паві тальныя дэпэшы Прэзыдэнту Рэспублікі, Маршалку І. Пілсудскаму, ваяводам Рачкевічу і Бечковічу. Адзін з прадстаўнікоў Горадзеншчыны запрапанаваў выслаць дэпэшу беластоцкаму ваяводзе. Прапазыка прысутнымі была прынята, прычым дэпэша маршалку Пілсудскаму была спаткана авацыямі.

Слова атрымаў Старшыня Т ва „Прасьветы" п. А. Якімовіч.

Тэлеграмы

Прэзыдэнту Рэспублікі.

Сабраныя на конфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады прадстаўнікі ваяводстваў Віленскага, Навагруцкага і Беластоцкага об'еднаныя каля Рады вітаюць Пана як першага Прадстаўніка нашай Дзяржавы.

Маршалку Пілсудскаму

Сабраныя на конфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады прадстаўнікі ваяводстваў Віленскага, Навагруцкага і Беластоцкага об'еднаныя каля Рады вітаюць Цябе Вялікі Павадыр Дзяржавы, магутная далонь якога зрушыла з мёртвага пункту Дзяржаву і пакіравала яе на здаровы шлях, і выражаюць нязломную надзею, што пачаты новы курс нацыянальнай палітыкі, яднаючы усіх грамадзян Рэспублікі пад лёзунгамі шчырага дэмократызму і толеранцыі, створыць лепшую будучыню і Беларускому Народу.

Віленскаму Ваяводзе п. Рачкевічу.

Сабраныя на конфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады прадстаўнікі ваяводстваў Віленскага, Навагруцкага і Беластоцкага об'еднаныя каля Рады вітаюць і выражаюць прызнаньне Пану Ваяводзе за шчырае, пастаяннае і прыхільнае трактаваньне патрэбаў Беларускага Народу.

Навагруцкаму Ваяводзе.

Сабраныя на конфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады прадстаўнікі ваяводстваў Віленскага, Навагруцкага і Беластоцкага об'еднаныя каля Рады выражаюць удзячнасьць за прыхільныя адносіны Пана Ваяводы да патрэбаў Беларускага Народу і выражаюць надзею, што санацыйная дзейнасьць, пачатая Панам Ваяводай, абойме ўвесь абшар Навагрудчыны. Зьезд апрача таго выражае сваю удзячнасць за падтрыманьне беларускага культуральнага асяродка, якім зьяўляецца беларуская гімназыя ў Навагрудку

Беластоцкаму Ваяводзе.

Сабраныя на конфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады прадстаўнікі ваяводстваў Віленскага, Навагруцкага і Беластоцкага об'еднаныя каля Рады, выражаюць прызнаньне за прыхільныя адносіны Пана да Беларускага Народу.

Прывітаньне п. С. Міцкевіча.

Далей забраў голас вядомы дэмакрата польскі і слаўны абаронца многіх беларускіх, палітычных вязьняў п. С. Міцкевіч, які ў шчырай і гарачай прамове вітаў прадстаўнікоў беларускага народу, і запэўняў, што тут на тэрэне Заходняй Беларусі павінна панаваць згода і братэрства народаў польскага і беларускага. Пан Міцкевіч у доказ магчымасьці іканечнасьці гэтай згоды прывадзіў гістарычныя мамэнты з мінуўшчыны гэтага краю, калі была ня толькі згода між беларусамі і палякамі, але была і запраўдная роўнасьць, сягаючая гэтак далёка, што нават дзяржаўныя дакумэнты, як Літоўскі Статут быў напісаны ў беларускай мове. Прамова шчырага краёўца была спаткана громам воплескаў.

Пасля гэтага выступіў з прамоваю Старшыня Т-ва „Прасьветы„ п. Якімовіч.

Даклад Старшыні Т-ва „Прасьвета" п. Якімовіча.

Вітаю Вас, грамадзяне, ад імені Беларускага Т-ва „Прасьветы", як старшыня ягоны. З тае прычыны, што гэтая конфэрэнцыя мае выключна мэты палітычныя, „Прасьвета", будучы арганізацыяй апалітычнай, удзелу ў гэтай конфэрэнцыі, як арганізацыя, браць ня будзе. Мы лічым, што усякая культурна-асьветная праца, павінна быць адсэпаравана ад працы палітычнай. Асабліва гэта важна, для прасьветы беларускай, якая, апрача рожных перашкодаў, церпіць яшчэ ў тым што пераплетаецца з працай палітычнай рожных палітычных групаў. Мы лічым, што мяшаньне культуры ў справы палітычныя ёсьць праступленьне перад гэтай культурай. Асабліва гэта праступленьне можа даць нязьлічымыя шкоды беларускай культуры, калі прасьветныя інстытуцыі дамешваюцца у сваей працы да арганізацыяў, маючых характар антыдзяржаўны.

З тае прычыны, што многія, тут прысутныя, не зьяўляюцца сябрамі „Прасьветы" і магчыма ня ведаюць, што „Прасьвета" робіць, я зраблю інфармацыйны даклад аб дзейнасьці яе за час ад яе паўстаньня і да сёнешнага дня.

1) Заложана Т-ва „Прасьвета" на зьезде Беларускага Настаўніцтва з усіх тэрэнаў Заходняй Беларусі, на якім было да 300—т дэлэгатаў. У той час гэта была першая беларуская асьветная арганізацыя, якая мела праўны Статут на ўсю Польшчу. Істнаваўшыя ў тым часе іншыя асьветныя беларускія таварыства, як Віленская Цэнтраньная Школьная Рада, Радашкуўскае і Навагрудскае Школьныя Т-ва мелі характар выключна лёкальны. Прасьвета адразу-ж прыступіла да арганізацыйнай працы і ня гледзячы на тое, што тэндэнцыя тагочаснага М-ва Асьветы, начале якога стаяў Ст. Грабскі, была зусім выразна скіраваны да разбіцьця беларускага культурнага руху і да зьліквідаваньня беларускага школьніцтва.

2) Т-ву „Прасьвета", пры дапам тагочасн. Міністра Унутр. Справаў п Тугутта і Ваяводы Віленскага п. Рачкевіча. удалося залажыць першую цагелку пад Беларускую Урадавую Пачатковую школу, адначасьна праз год змаганьня, пасьля дзесятку мэморыялаў і асабістых інтэрвэнцыяў у Міністэрствах прадстаўніка „Прасьветы", былі адчынены Урадавыя Беларускія Настаўніцкія Курсы ў Вільні і ў Кракове для безработнага Беларускага Настаўніцтва. Нажаль Міністэрству Асьв. удалося, папэрэдня устаноўлены лік у 200 курсантаў, абрэзаць да 88: 48 у Вільні і 40 у Кракаве. Курсы трывалі 10 ць месяцаў і ў ліпні 1926 г. была выпушчана 78 першых кваліфікаваных беларускіх педагогаў.

3) Маладая „Прасьвета" прыняла удзел у народным плебісцыце падчас складаньня дэкляраціяў на беларускую пачаткавую школу і ў раёнах, дзе „Прасьвета" найбольш была моцнай, быў зложаны найбольшы лік дэкляраціяў, як напрыклад у Нясьвескім павеце на 32 школы.

4) З самаго-ж паўстаньня „Прасьветы" пад яе уплывы папала Беларуская Гімназыя у Клецку—адна з 4-х істнуючых у нас у Польшчы. Проціў гэтай гімназыі веў сыстэматычную акцыю Куратарыюм Бераскі з мэтай яе зачыніць і вось тутака Прасьвета вытрывала ў абароне своей роднай школы—можна сказаць тытанічную барацьбу. Апрача усякіх перашкодаў,—што няма адпаведнага лёкаля, што няма тэхнічных абарудаваньняў, наглядных школьных прыладаў і г. д. і г. д. Куратарыюм не зацьвердзіў, ані воднага з настаўнікаў—адных з прычыны недастатачнага стажу, другіх—недастатачнай кваліфікацыі, а то проста з прычыны палітычнай неблаганадзейнасьці,—аднак-жа, ў 1926 годзе концэсія была атрымана, варункова. Безумоўна, ўсе гэта адбілася страшэнна як на супакойным ходзе заняткаў, а значыцца і пасьпеху вучняў, так галоўным чынам на лічбе вучняў, якіх у 26 годзе было 120-ць

5) У гэтым 1926—27 годзе, ня гледзячы на адбыўшыся маёвы пераварот і на новы кірунак Цэнтральнага Ураду, Куратарыюм у Берасьці рашыў за усялякую цану зачыніць Гімназыю ў Клецку і стаў прысылаць ультыматыўныя, абсалютна невыпаунімыя трэбаваньня—нарэшце адмовіў у концэсыі. Аднак-жа „Прасьвета" пайшла на праступленьне дзеля абароны сваей культурнай інстытуцыі: узяла ўсю справу пад сваю адказнасьць, усе высілкі, усю справу скіравала у М-во Асьветы, запрапанавала гімназыі стварыць экзамены, распачаць школьны год Куратарыюм пагражаў зьвярнуцца да Старасты, каб ён адміністрацыйна зачыніў гімназыю. Гэтая барацьба трывала 9-ць месяцяў, гэта значыцца, што ў працягу 6-ці месяцаў гімназыя існавала нелягальна. Аднак жа ў лютым месяцы 1927 года концесія гэта была атрымана.

6) Прасьвета, абараніўшы Гімназыю ў Клецку, дапамагае ей матэрыяльна, асыгнуючы пэўныя сумы грошы штомесячна.

7) Адначасна Прасьвета нясла культуру ў нашу цемную вёску: закладаліся ўсюды, у самых глухіх беларускіх кутках аддзелы „Прасьветы", закладаліся бібліётэкі чытальні, давалася ініцыятыва і падтрыманьне з цэнтру гэтым асяродкам Прасьветы і культуры ў беларускай вёсцы. Гэтак былі заложаны гурткі "Прасьветы" ў паветах: Слонімскім, Навагрудзкім, Нясьвіскім, Баранавіцкім, Валкавыскім, Гарадзенскім, Маладэчненскім, Валожынскім, Вялейскім.

8) Пры ўсіх правінцыяльных аддзелах стараньнем Цэнтру былі заложаны бібліётэкі-чытальні, групы аматорскія — тэатральныя і музыкальныя, якія ладзілі спэктаклі. Прыкладам, насколькі беларуская культурная праца паглыбілася на вёсцы, зьяўляецца праца Дунайчыцкага Аддзела Прасьветы, дзе ў працягу некалькіх гадоў паставілі некалькі дзесяткаў беларускіх спэктакляў. Былі пераіграны ўсе істнуючыя ў Заходняй Беларусі беларускія пьесы, разам з гэтым і некалькі польскіх. Тэатральная вясковая Дунайчыцкая трупа нават рабіла турнэ ў іншыя суседнія беларускія вёскі.

9) „Прасьвета" апошнімі часамі, выхоўваючы дух у маладым беларускім пакаленьні, зьвярнула увагу на фізычнае выхаваньне гэтай моладзі. З гэтай прычыны пры Аддзелах „Прасьветы", з ініцыятывы Цэнтру, пачынаюць арганізавацца беларускія спортыўныя групы: гэтакіх груп ёсьць ужо 5-ць у Дун. Баранав., Сін., М.-Слаб. Тўчы. Пакуль што арганізуюцца футбольныя каманды.

10) Зразу-жа па сканьчэньні першых Беларускіх Настаўніцкіх Курсаў, „Прасьвета", лучна з Беларускай Нацыянальнай Радай, паднялі пытаньне і пачалі прасіць аб адкрыцьці новых Настаўніцкіх Беларускіх Курсаў у Вільні. Паводля газэтных вестак, гэтыя курсы маюць быць у восень адчынены. Але, нажаль, будучы ініцыятарам гэтых курсаў „Прасьвета" пакуль што ніякага удзелу як у адкрыцьці, так і ў прэдстаўленьні кандыдатаў, ня бярэ.

11) З гэтага кароткага нарысу можна сконстатаваць адно: а) беларускі культурны рух расьце і глыбіцца, в) няма ўжо на вёсках больш людзей, якія ня ведаюць, што яны Беларусы, с) насяленьне цягнецца да роднае школы, да кнігі і газэты разьбіраюцца на расхоп.

Цярністы шлях беларускіх культурных працаўнікоў, як тых, якія будучы з вышэйшай адукацыяй, працуюць за грашы ў нашых беларускіх гімназыях, цяжкі ён і тым піянэрам, якія нясуць культуру і асьвету ў здэмаралізаваную па войнах і рэвалюцыях вёску, але нацыянальная сьвядомасьць расьце з кожным днём і абхаплівае усё шырэйшыя кругі, расьце і шырыцца беларускі культурны рух.

Пасьля кароткага перарыву выступіў з дакладам Старшыня Б. Н. Р. п. А. Паўлюкевіч.

Даклад Старшыні Б. Н. Р. п. А. Паулюкевіча.

Пражыты год выдаўся цяжкі, ня гледзячы на тое, што на чале Ураду стаіць Маршалак Пілсудскі. Хоць маёвы пераварот вывяў наверх дзяржаўнага жыцьця шмат запраўдных дэмократаў, прыхільна адносячыхся да беларусаў, але засталося яшчэ шмат цёмных сілаў прашкаджаючых ім у працы. Апрача істнаваўшых раней, стварылася шмат новых палітычных партыяў і групаў, што шкадліва адбіваецца на Дзяржаве і насяленьні. Напрыклад у Англіі істнуюць толькі тры партыі—консэрватараў, лібэралаў і работніцкая, левае крыло якой выразна адхілілся ў бок камунізму. А ў нас іх больш дзесятку. Гэтыя партыі вядуць упартую барацьбу між сабою. Палітыка Маршалка Пілсудскага ідзе ў напрамку скасаваньня партыйніцтва. Партыі пачынаюць трэціць усякі ўплыў на дзяржаўнае жыцьцё. Нават P.P.S. і Wyzwolenie, якія прыймалі актыўны ўдзел у маёвым пераавароце, разчараваліся ў сваіх надзеях і перайшлі да апазыцыі пасьля таго, як былі пазбаўлены магчымасьці рабіць які-небудзь уплыў на асобу Маршалка Пілсудскага і яго дзяржаўную працу. Гэткім чынам неясная ў пачатку палітыка Маршалка Пілсудскага пачынае паволі выясьняцца. Ен хоча арганізаваць Польшчу звонку партыяў. І вось мы бачым што ў яго Урадзе сядзяць разам дэмократы з сацыялістамі і манархістамі. Зроблена падбор асобаў не па прынцыпу партыйніцтва, а ў залежнасьці ад асабістай здольнасьці і уплыву ў грамадзянстве.

Затым, апошні год выдаўся вельмі цяжкім у гаспадарчым жыцьці. Уражай быў благі. Уся гэта цяжасьць адбілася на народзе, як плацельшчыку падаткаў. Вось дзеля чаго мы так паволі адчуваем тое, што на чале ўраду стаіць Маршалак Пілсуцкі і што началася „маевая санацыя".

Нарэшце ёсьць яшчэ адна прычына, вельмі шкадліва адбўшаяся на беларускай справе. Я маю па ўвазе „Грамаду". Карыстаючыся наступіўшымі ў выніку маёвага

пераварту палёгкамі. Грамада разпачала вельмі энэргічную працу. Выступіла з гучнымі і рэвалюцыйнымі лёзунгамі, якія ўпачатку рабілі вялікі ўплыў на больш незадаволеныя экспансыўныя маладыя элемэнты. Грамада не называла іншыя беларускія партыі іначэй, як дэфэнзыўшчыкамі, здрайцамі народу і гэтак далей. І гэта Грамадоўская работа вельмі шкадліва адбілася на адносінах да нас як ураду, гэтак сама і мейсцовых уладаў. А дзеля таго, што Грамада ў сваей рабоце паставіла ўсе кропкі над і, выразна апіраючыся на Менск, дык і польскі народ зьмяніў свае адносіны да нас. Усе пачалі глядзець на нас, як на бальшавікоў. Усе першыя начынаньня Ураду Марш. Пілсудскага, як выбары да самаўрадаў, школьнае пытаньне меньшасьцяў і г. д., былі адсунуты ва задні плян, а на пярэдні была высунута барацьба з Грамадой.

Але пасьля разгрома Грамады начынаюцца даўно чаканыя рэформы. Адбылася першая польско-беларуская конфэрэнцыя ў Вільні па школьнаму пытаньню, на якую былі запрошаны выдатнейшыя асабістасьці з польскага і беларускага пэдагогічнага сьвету. Урад з ініцыятывы ваяводы Бэчковіча пачаў выдаваць грашавую запамогу для Навагруцкай гімназыі у размеры 600 зл. у месяц і арганізуецца інтэрнат. Гэта ужо вялікі крок уперад, бо яшчэ нядаўна як гэтай гімназыі так асабліва Клецкай, як мы бачылі з дакладу Старшыні „Прасьветы“ п. Якімовіча, рабіліся ўселякія перашкоды. На восень будуць адкрыты беларускія вучыцельскія курсы. Выдаюцца грашавыя запамогі на адбудову зьнішчаных вайной вёсак. Толькі аб гэтым трэба самім рупіцца, крычэць і напамінаць. Мы бачым, што гаспадарчая н права краю выступае на першы плян.

Як-жа ў гэты час ішло жыцьцё сярод беларусаў?

Грамада выразна стала на рэвалюцыйным шляху. Тыя рэпрэсыі, якія ўрад застасаваў да Грамады насьля маёвага пераварту, былі-бы непатрэбны, калі-б Урад зьвярнуў большую ўвагу на Крэсы. У Грамадзе апынулася шмат асобаў, проста, па свайму лёгкаверу, бо Грамада глыбокіх корняў у народзе ня мела. Калі Уряд вылячыць балячкі крэсовага жыцьця, дык і Грамада згіне сама сабой. І наадварот: балячкі істнуюць і Грамада жыве, толькі падпольна. Нажаль ня ўсе кіруючыя чыньнікі Варшавы займаюць выразны кірунак. А сам Марш. Пілсуцкі ня можа абняць усе галіны дзяржаўнага жыцьця. Яскравым прыкладам гэтага служыць няўдалая спроба прэзэса „Instytuta do badań spraw Narodowościowych“ пасла Тургута, згаварыцца на мейсцавым грунце з прадстаўнікамі беларусаў.

Пасол Тургут дапусьціўся гэтакай недарэчнасьці, шчо запрашаючы на конфэрэнцыю толькі некалькі паасобных беларусаў, запрасіў разам з імі і гр. Антона Луцкевіча, чалавека, як ведама, страціўшага абсолютна усялякую маральную вартасьць у беларускім грамадзянстве. Было-бы больш лёгічна запрасіць грамадаўскіх паслоў, якія сядзяць у турмах, чым патаемнага інспіратара і фактычнага кіраўніка Грамады, рэдактара і перадавіка пасквільнай і антыдзяржаўнай „Нашай Праўды“. Спроба паразуменьня п. Тугута з гр. Луцкевічам аказалася больш як няўдалая, бо зараз жа пасьля парады гр. Луцкевіч высьмеяў усю нараду, „Instytut badań“ і п. Тугута ў сваей газ. „Наша Праўда“. Гэтая нарада, аб якой адазвалася нават і польская прэса (!) зрабіла вельмі прыкрае ўражэньне на белерускае грамадзянства.

Другі факт. Творацца вучыцельскія курсы, але ні адна беларуская інстытуцыя ня прыймае удзелу ў гэтай працы.

Апрача Грамады ёсьць яшчэ Сялянскі Саюз паслоў Ярэміча і Рагулі. Сялянскі Саюз думаў, шчо пасьля разгрому Грамады займе яе мейсца, выступіўшы з лёзунгамі клясавай барацьбы. Але абмыліўся. Народ шукае толькі пэўных і спакойных шляхоў. Рэвалюцыйнасьць Грамады імпанавала Народу, бо за ёй выразна стаяла Радавая Беларусь з яе арміяй і грашыма. Рэвалюцыйнасьць-жа Сялянскага Саюзу не мае гэтай падпоры і дзеля таго зусім не імпануе народу.

Калі зьвернем увагу на партыю Хадэкаў, дык праца іх, значна аслабла з тэй прычыны, што два выдатных правадыры былі прымусова адсунуты ад актыўнай палітычнай працы: Вядомы беларускі дзеяч ксёндз Гадлеўскі пасаджан на два гады ў крэпасьць а кс. Станкевічу па разпараджэньню віленскага мітрапаліты, забаронена палітычная праца. Аднака Хадэкі захавалі свой ўплыў сярод каталіцкага беларускага насяленьня.

Пасьля ўсяго гэтага бачым, што няма партыі ці групы, якая бы знала каля сябе ўвесь беларускі нарад. Яшчэ да разгрома Грамады масы яе сяброў выхадзілі з яе. Як Грамада, гэтак сама і Сялянскі Саюз з лёзунгамі клясавай барацьбы ня маглі павясьці за сабою Народ. Гэткім чынам выяўляецца патрэбнасьць аб'еднаньня па нацыянальным грунце усіх слаёў беларускага народу Белар. Нац. Рада, стаячая на грунце нацыянальным, пачала прыймаць на сябе функцыі, якіх ня выпоўніў ні пасольскі клюб, ні ўказаныя партыі. Хаця першы прашлагодні зьезд не спаткаў наляжытай ацэнкі і падтрыманьня ў польскіх сфэрах, але затое знайшоў падтрыманьне ў беларускім народзе. Нашыя рады з кожным днём гусьцеюць і крэпнуць, ня гледзячы на тое, што Нац. Рада не магла аканчальна выпаўніць сваей місыі н да маёвага ні пасьлямаёвага пераварту. Нашыя рады, як я сказаў, крэпнуць і навялічваюцца дзякуючы выключна таму кірунку, які ад пачатку мы накрэсьлілі сабе. Галоўнымі рысамі гэтага кірунку ёсьць: *1) Нацыянальная ідэя, 2) лёяльнасьць да Польшчы, 3) спакойная і павольная творчасьць працы і 4) змаганьне з усялякімі праявамі бальшавізму.*

Не так даўна зьезд апошні быў непапулярны дзякуючы таму, што бальшавізм зьвязаў сябе ў Менску з беларускім рухам. Цяпер нават Сялянскі Саюз і Хадэкі выступаюць проці камунізму. У гэтым наша заслуга і мы зьбіраем плады. Мы лічым, што ўсе беларусы павінны ісьці толькі у нацыянальным напрамку. Усе беларусы павінны сайціся толькі пад гэтым сьцягам.

Сяньня мы павінны вырашыць, як канкрэтна падайсьці да гэтага пытаньня. Есьць дзве прапазыкі: 1) стварыць палітычную партыю без Рады і 2) каб Нац. Рада заставлася, а паралельна з ёю каб была створана палітычная партыя, якая еднала-бы пад адным нацыянальным сьцягам усіх беларусаў. Вам, паны, прапануецца гэта пытаньне вырашыць. Прашу толькі аднясьціся да гэтага паважна.

Дэкларацыя Райённага Камітэту „Вызваленцаў“ аб прылучэньні да Бел. Нац. Рады.

Браты Беларусы!

Вітаю Вас, як Старшыня райённаго Камітэту П. Н. П. Вызваленьня“ ў Палачанах. Наш камітэт стаіць на чале 1216 сябраў з паветаў Маладэчанскага, Валожынскага і Ашмянскага.

Ідучы за „Вызваленьнем“ у часе выбараў, мы глыбака верылі гэтай партыі, верылі яе шырокай праграме, якая перад усім бараніла інтарэсы сялянства.

Адвак жа пекная праграма „Вызваленьня“ разайшлася з самай дзейнасьцяй гэтай партыі. У Сойме нашыя паслы ня толькі ня здужалі абараніць інтарэсаў нашага селяніна, але яшчэ зрабілі вялікую крыўду беларускаму сялянству, галасуючы там за ваеннае асадніцтва на крэсах. Што датычыцца шырака абецаных палепшаньняў у бок нашае мовы, культуры, школы, дык „вызваленцы“ пекна толькі абяцалі, дый вось пісалі пабеларуску ў часе выбараў агітацыйныя лісткі.

Дзеля гэтага сымпатыі да „Вызваленьня“ у народзе пачалі падаць. Аднак-жа мы, ня будучы задаволены гэтай партыяй, не пакінулі адразу яе. Мы доўга разглядаліся, дзе шукаць ратунку, куды ісьці. У гэты час на нашым тэрэне паўстала Грамада. Вось некатарыя сябры, як пчолы, пачалі пералятаць з „Вызваленьня“ да Грамады, бо яна гэтак пекна абяцала нашаму змучанаму беларусу школы, самаўрады, а перад усім — зямлю

Аднак-жа мы зразумелі, што народ нашрвецца да сваей роднай беларускай арганізацыі. Чытаючы беларускія газэты найлепей нам падабалася „Беларускае Слова“ Беларускай Нацыянальнай Рады. І вось паволі мы праканаліся, што нарэшце знайшлі тое, што нам было трэба: арганізацыю, якая бароніць інтарэсы беларускага народу, арганізацыю, лёяльную да Польшчы, нашу родную беларускую арганізацыю.

І вось мы паслалі просьбу да Бел. Нац. Рады, каб яна нас пазнаёміла драбязгава з сваёй праграмай і дзейнасьцяй. Пан Старшыня зараз-жа адазваўся, выслаў нам больш газэтаў, матэр'ялаў і два разы прыягджаў сам. А сёньня прыехалі мы да Вас. І тутка, сярод родных сяброў, сярод роднай мовы мы пачулі, што мы не памыліліся, а тая адкрытая роўная дарога, на якую кліча дэмократычная праграма новай Бел. Нац. Партыі гварантуе нам, што мы даб'ёмся палепшаньне нашага цяжкага жыцьця. Гэта пракананьне ў нас тым мацней, што мы заўсёды верылі Маршалку Пілсудскаму, і тое, што ён стаіць сяньня на чале Дзяржавы, украпляе ў нас надзею.

Дык няхай жыве Польшча!

Няхай жыве Маршалак Пілсудскі!

Нехай жыве Беларускі Народ!

Няхай жыве „Бел. Нац. Рада!“

Старшыня камітэту і інструктар акружны Віленшчыны, Навагрудчыны П. Н. П. „Вызваленьня“.

М. Пятровіч.

Скарбнік *М. Белан.*

Сэкрэтар *С. Гарцыновіч.*

ПРАГРАМА.

Беларускай Нацыянальнай Партыі

І Ідэал Беларускага народу


§ 1. Б. Н. П. лічыць сваім Ідэалам незалежнасьць злучаных земель Беларускага Народу.

І. Аўтономія.

§ 2. Стоячы на грунце Польскай Дзяржаўнасьці Б. Н. П дамагаецца шырокай тэрыторыяльнай і культурнай аўтономіі зямель Заходняй Беларусі.

III. Нацыянальная Еднасьць.

§ 3. Лічучы, што ўся сіла Народу ёсьць у яго нацыянальнай сьвядамасьці і еднасьці усіх грамадзян Б. Н. П. выстаўляе прынцып нацыянальны ў праціўвес сацыяльнаму і лічыць, што клясавая барацьба разьбівае нацыянальную еднасьць, і імкнецца да згоды і нацыянальнай еднасьці усяго Беларускага Народу, каб селянін, інтэлігэнт і работнік разам і згодна працавалі пад адзіным нацыянальным сьцягам над адраджэньнем і будаваньнем Беларусі.



Англійскі прэм'ер Балдўін, які рашыўся разарваць гандлёва-дыплёматычныя адносіны з бальшавікамі.

IV. Барацьба з камунізмам

§ 4 Выдвігаючы прынцып нацыянальны Б. Н. П. змагаецца усімі даступнымі спосабамі з доктрынай комунізму і яе праявамі ў жыцьці, як з вучэньнем, падрываючым нацыянальныя асновы дзяржаўнага будаўніцтва.

V. Барацьба за Усходнюю Беларусь.

§ 5. Б. Н. П. Змагаецца за вызваленьне зямель Усходняй Беларусі з пад улады камуністычнай партыі і імкнецца да злучэньня Усходняй Беларусі з Заходняй.

VI. Зямля сялянам

§ 6. Прыймаючы пад увагу многавяковую эксплёатацыю сялянства імучымі клясамі, разарэньня ад вайны і беднасьць сялянства, Б. Н П. дабіваецца каб беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымалі зямлю безплатна.

§ 7. Б. Н. П. однак-жа будзе дамагацца пераходу усіх зямель буйных земляўласьнікаў, дзяржаўных і іншых, да сялянства усімі даступнымі спосабамі, дапускаючы набываньне зямлі і за плату, але пры дапамозе дзяржаўных банкаў у крэдыт, з разсрочкай платы за зямлю на 50 гадоў

§ 8. Б. Н. П. дамагаецца утварэньня дзяржаўнага зямельнага сялянскага банку са спэцыяльнай мэтай для шырокага крэдыту сялянам пры пакупцы імі зямлі.

§ 9. Б. Н. П. прызнае дапушчэньне куплі зямлі з тае прычыны, што за час змаганьня за безплатны надзел зямлёй беларускага сялянства, уся дзяржаўная і буйная прыватная зямля можа быць распродана і распарцалявана, і можа зусім не трапіць да Беларускага сялянства.

§ 10. З тае прычыны, што частка беларускіх абшараў была безплатна раздадзена асаднікам, Б. Н. П. дамагаецца, каб гэткая-ж частка зямлі з раз-жа была раздадзена безплатна мейсцоваму сялянству на тых-жа варунках, што і асаднікам.

VII. Зямельныя Камісіі.

§ 11. Зямельная рэформа павінна неадкладна праводзіцца ў жыцьцё пры помачы самаўрадаў, праз асобыя самаўрадавыя зямельныя камісіі.

§ 12. Зямельныя самаўрадавыя камісіі павінны працаваць у контакце з дзяржаўнымі земскімі камісарамі падчас выкананьня агульна дзяржаўнага парцэляцыйнага пляну.

VIII. Норма зямлі

§ 13. Залежна ад якасьці зямлі і варункаў працы на ей, зямельныя самаўрадавыя камісіі устанаўляюць для кожнай мяйсцовасьці норму для самастойнай індывідуальнай гаспадаркі

IX. Дарэзка зямлі.

§ 14. Тым земляробам, якім зямлі не хапае, яна павінна быць дарэзана да нормы устаноўленай зямельнымі камісіямі.

X. Хутарская гаспадарка.

§ 15. Б. Н. П. процiў усялякіх спробаў колектыўнага зямлякарыстаньня (як напрыклад — комуна), выстаўляе прынцып індывідуальнага зямлякарыстаньня (хутарская гаспадарка) на падставах зямельнай прыватнай уласнасьці.

XI Комасацыя і мельёрацыя.

§ 16. Усе чэразпалосныя землі, нават тых вёсак, якія ня хочуць перайсьці на хутары, павінны быць скомасаваны (у адным куску) і мельёраваны (балоты осушаны, а пяскі абводнены).

XII. Пераход на хутары

§ 17 Пры комасацыі і пры пераходзе на хутары Дзяржава і самаўрады павінны дапамагаць грашыма ў форме доўгатэрміновай безпрацэнтавай грашовай пазыкі сялянам. Лес і іншыя матэр'ялы на адбудову павінны выдавацца безплатна, як роўным чынам і усе работы зьвязаныя з парцэляцыяй і комасацыяй павінны рабіцца на дзяржаўны кошт.

XIII. Лясы і нетры зямлі.

§ 18. Лясы, воды, падземныя багацьця і інш. становяць уласнасьць самаўрадаў.

§ 19. На апал і будоўлю вызначаецца патрэбны лік лесу.

XIV. Асадніцтва спыніць.

§ 20. Як вайскавае так і прыватнае калёнізацыя (асадніцтва) павінны бы быць заразжа спынены. Зямля павінна быць распарцалявана на ўласнасьць выключна паміж мейсцовым беззямельным і малазямельным сялянствам:

XV. Культурна-гаспадарчае адраджэньне.

§ 21. Б. Н П. імкнецца да падняцьця культурнага роўня сялянства, каб гаспадараваньне на зямлі праводзілася сучаснымі культурнымі способамі. З гэтай мэтай Б.Н.П. імкнецца да арганізацыі земляробскіх кружкоў паказацельных гаспадарак, арганізацыі пунктаў расовай скаціны для карыстаньня насяленьня і г. д.

XVI. Крэдыт вёсцы.

§ 22. Б. Н. П. імкнецца да арганізаваньня капэратыўных вясковых банкоў і касаў пазычковых, дзе можна было бы даставаць танны крэдыт, пад забяспечаньне сваіх гаспадарак. Гэтым банкам і касам павінен быць запэўнены шырокі дзяржаўны крэдыт.

XVII. Прасьвета.

§ 23 Навука у пачатковых школах павінна праводзіцца ў роднай мове насяленьня безплатна на дзяржаўны кошт і абавязкава для усіх. Павіны быць адчынены урадавыя сярэднія беларускія школы, як агульна адукацыйнага, так і спэцыяльнага характэру (гаспадарчыя, рамесьленыя і інш.).

§ 24. Навука ў прыватных школах, як пачатковых, так і сярэдніх павінна карыстацца поўнай урадавай дапамогай.

§ 25 Закон Божы, як падстава моралі народу, павінен абавязкава выкладацца у школах у роднай мове.

XVIII. Рэлігія.

§ 26. Усе грамадзяне карыстаюцца з свабоды сумленьня і веры.

§ 27. Як Беларускі Касьцёл, так і Беларуская Царква павінны карыстацца, як і каталіцкае і праваслаўнае духавенства роўнымі правамі

§ 28. Беларускі Касьцёл і Беларуская Царква павінны ужываць у сваім унутраным жыцьці (казаньне, споведзь і г. д.) роднай мовы.

§ 29. Касьцёл і Царква у сваіх адносінах да Дзяржавы павінны карыстацца паўнатой аўтономных правоў, паводле сваіх рэлігійных кановаў.

XIX. Самаўрады

§ 30. Стоячы на грунце шырокай тэрыторыяльной аўтономіі Б. Н П дамагаецца шырокіх самаўрадаў, выбраных на падставах агульнага, простага, тайнага, роўнага і пропорцыянала галасаваньня.

Ува усіх адміністрацыйных, самаўрадавых, судавых і школьных інстытуцыях на

Палітычны агляд.

Усяі Эўропа і нават увесь сьвет жыве пад уражэньнем разрыва англійска-радавых адносінаў, паступіўшага ў выніку зробленага вобыска ў бальшавіцкім шпіёнскім прытоні ў Лёндоне пад назовам „Аркос“. Але гэта быў толькі безпасрэдні повадe, у той час як запраўдная прычына крыецца значна глыбей. Але раней, чым прыступіць да асьвятленьня гэтага факта, маючага велізарнае значэньне для далейшага разьвіцьця падзеяў у Эўропе, трэба адзначыць тыя прычыны, якія дадалі, Англіі сьмеласьці на гэткі рашучы крок. Гэта—зьмяніўшаяся сытуацыя на Далёкім Усходзе, конфэрэнцыя Малай Антанты і пацьверджэньне англійска-францускай згоды.

Няўдача бальшавікоў на Далёкім Усходзе

зьяўляецца пачаткам іх канца. Толькі пасьля гэтага Англія магла аправіцца, перадыхнуць і прыступіць да далейшай рэалізацыі свайго пляну барацьбы з бальшавізмам. Але дзеля гэтага трэба было падрыхтаваць эўрапэйскі тэрэн, куды бальшавікі перанясьлі сваю барацьбу з Англіяй пасьля свайго паражэньня ў Кітаі, і дзе яны маюць свайго магутнага і крывадушнага хаўрусьніка ў асобе Нямеччыны. Да гэтага далучылася яшчэ няпэўная сытуацыя ў Сярэдняй Эўропе і на Балканах. Але ўсе гэтыя сумлівасьці разсеяла

конфэрэнцыя Малой Антанты,

якая адбылася нядаўна ў Яхімаве ў Чэха Славацыі. Гэта конфэрэнцыя тым большую заслужвае ўвагу, што перад гэтым лічылася многімі, ў зьвязку з італьянска румынскім зьбліжэньнем, што Малая Антанта фактычна ўжо перастала істнаваць. Якое вялікае зацікаўленьне было гэтай конфэрэнцыей, служыць той факт, што на яе зьехалася з усіх дзяржаваў каля 120 толькі адных журналістаў, у тым ліку 22 польскіх, 17 чэскіх, 16 Юга-Слаўскіх, 14 румынскіх, некалькі англійскіх, амэрыканскіх, італьянскіх і нават два бальшавіцкіх. Конфэрэнцыю вялі чэскі міністар заграні́чных справаў Бэнэш, румынскі—Міцілінэў і Юга-Слаўскі—Марынковіч

М а л а я А н т а н т а,

ці хаўрус Чэха-Славацыі, Румыніі і Юга-Славіі стварыўся пасьля развала Аўстра Вэнгэрскай дзяржавы з галоўнай мэтай абароны істнуючых мірных трактатаў і status-quo у Сярэдняй Эўропе. У часе сьці—прашкаджаць рэстаўрацыі Манархіі ў Вэнгрыі і аб‘ядваньню Нямеччыны з Аўстрыяй. І да апошняга часу гэта місыя выпоўнялася Малаю Антантаю памысна. Зусім зразумела, што Малая Антанта зьяўляецца бяльмом у воку тых, хто, як Нямеччына, Вэнгрыя і Боўгарыя, незадаволен істнуючым палажэньнем. Гэтак сама зразумела і тое, чаму чуткі аб крызысе, перажываемым Малаю Антантаю, выклікалі, перапалох сярод тых, хто зацікаўлены ў сахраненьні эўрапэйскага міру. А былі вельмі паважныя повады да трывогі за судзьбу міра ў сярэдняй Эўропе і на Балканах пасьля таго, як да Нямецка вэнгэрскай небясьпекі з поўначы і бальшавіцкай з Усходу далучылася яшчэ італьянская з поўдня, а Румынія і Вэнгрыя заключылі з Італіяй паасобныя трактаты прыязьні. Гэта быў той момэнт, калі Юга-Славія пагражала нават зьбліжэньнем з Нямеччынай і калі сэрбска-італьянскія адносіны, гэтак сама як і француска італьянскія былі так нацягнуты, што ў кожную хвілю можна было чакаць збройнай спатычкі між гэтымі трымя дзяржавамі. А гэтакая нявыразная і нэрвовая сытуацыя, як ведама, найлепш спрыяе бальшавіцка-нямецкім інтрыгам. Зусім зразумела, што пры такіх абставінах Англія ня магла рашыцца на той крок у адносінах да Радавай Расеі, які зрабіла цяпер. Але конфэрэнцыя 15 г. траўня ў Яхімове сьцвярдзіла, што Малая Антанта істнуе па стараму і што сябры яе як і да гэтай пары будуць цьвёрда стаяць на стражы міра ў Сярэдняй Эўропе і сахраненьня мірных трактатаў.

Але гэта толькі адзін з чыннікаў гарантыі эўрапэйскага міру, галоўным фундамэнтам якога служыць англійска-француская згода. А ў адносінах Францыі з Англіяй гэтак сама наступіла ў апошнім часе асьтуджэньне ў зьвязку з балканскімі падзеямі. Каб толькі схіліць на свой бок Італію ў момэнт рашучай барацьбы з бальшавізмам, Англія мусіла пайсьці на вялікія концэсыі на карысьць апошняй, даўшы ёй сваю згоду на свабоду дзейства на Балканах і Блізкім Усходзе. Гэта моцна занепакоіла Францыю, інтарэсам якой магла паважна пагражаць Італія ў Малай Азыі і Афрыцы. Усім добра памятна, якае згушчанае палітычнае паветра вісела над Француска-італьянскай граніцай у канцы мінулага і пачатку бягучага году, асабліва пасьля раскрыцьця правакацыйнай афэры Гарыбальдзі. У паветры адчуваўся нават пах пораху. І за ўсе гэта Францыя абвінавачвала Англію, з тайнай згоды якой Мусаліні сьмела гаспадараваў на Блізкім Усходзе Вось дзеля чаго ў гэты час істнавала вялікая небясьпека развала Вялікай Антанты, якая трымаецца толькі англійска-французкім хаўрусам, і якая служыць фундамэнтам агульнага эўрапэйскага міру. І невядома, чымбы скончылася ўсё гэта, калі-б не апынулася Англія ў вельмі цяжкай сытуацыі на Далёкім Усходзе і не патрэбавалася бы для яе ваеннае падтрыманьне з боку Францыі ў Шанхаі пасьля ханькоўскіх і нанкінскіх падзеяў. Далучэньня Францыі да супольнага выступленьня пяці вялікіх дзяржаваў з нотаю пратэсту проці нанкінскага бандытызму

заставілі зьмяніць папярэднюю пазыцыю Англіі ў адносінах да Францыі

Гэта адразу ж адбілася і на італьянска-францускіх, як роўным чынам і на італьянска-сэрбскіх адносінах, бо Англія зрабіла націск на Італію, ў тым сэнсе, каб яна хвілёва спыніла сваю агрэсыўнасьць і ўрэгулявала албанскі конфлікт шляхам безпасрэдніх пераговораў з Юга-Славіяй. Мусаліні падпарадкаваўся парадзе Англіі і адразу парадзела палітычнае паветра над Заходняй Эўропай.

Але ёсьць яшчэ і другі факт, заставіўшы Англію ісьці на згоду з Францыяй. Гэта

турэцка-сербскі хаўрус,

падрыхтаваны Радавай Расеяй. Гэткая камбінацыя зусім бурыць ангельска-італьянскія пляны на Блізкім Усходзе і паважна пагражае ангельскім інтэрэсам у Мэсапатаміі і Масуле. Італія ня здольна для барацьбы на два фронты, з Юга Славіяй і Турцыяй, падтрымліемай бальшавікамі. Толькі поўная згода Англіі з Францыяй можа гарантаваць небясьпеку Англіі на Бл. Усходзе. Гэткім чынам злажылася памысная агульная сытуацыя для ўзмацненьня англійска-францускай дружбы, якая цягнецца без перарыву ад 1904 году, калі Расея вяла вайну з Японіяй і французка-расейскі хаўрус казаўся Францыі недастатачным для абароны проці нямецкай агрэсыўнасьц.

Фінансавае і палітычнае палажэньне Францыі гэтак сама патрабуе дружбы з Англіяй. Французкі прэзыдэнт ужо даўна абяцаў зрабіць візыт Англіі, толькі чакаў на адпаведную хвілю, якая і надыйшла ў сярэдзіне бягучага месяца

Візыта Думэрга і Брыяна ў Англіі

перайшла у маніфэстацыю англійска-францускай дружбы, якая была яскрава падкрэсьлена ў афіцыяльных прамовах англійскіх і французкіх прадстаўнікоў вышэйшай ўлады. А ў гэты час Чэмбэрлен і Брыян абговарылі на тайных конфэрэнцыях усе бягучыя справы, датыкаючыяся абедзьвюх дзяржаваў, як кітайская, Бл. Усходняя, Балканская, Нямецкая і галоўным чынам радавая. І, згодна з заявай Брыяна і Чэмбэрлена, па ўсім гэтым справам была дасягнута поўная згода Толькі пасьля усяго гэтага Англія магла рашыцца на разрыў дыплёматычных адносінаў з Радавай Расеяй.

Разрыў дыплёматычных і гандлёвых адносінаў між Англіяй и Радавай Расеяй

аб якім заявіў прэм‘ер Балдўін у ніжшай палаце, служыць зваротным пунктам у заходня-эўрапэйскай палітыце ў Адносінах Радав. да Расеі. Значэньне гэтага факту вялізарнае. Ен закрывае сабой першы перыёд пасьля ваеннай гісторыі, перыёд пробаў паразуменьня Заходняй Эўропы з бальшавіцкай Расеяй і пачынае новы пяріёд барацьбы з бальшавізмам, пацярпеўшым поўнае паражэньня ў Азыі. Англія першаю ўступіла на гэты шлях паразуменьня з бальшавізмам і першая разрывае з ім усялякія адносіны, пераканаўшыся на ўласным прыкладзе ў шкадлівасьці гэтага шляху. Усе высілкі Л. Джорджа і Мэкданальда паразумецца з Масквой і прымірыць з ёю Зах. Эўропу аказаліся безскутэчнымі. Гэтым актам Англія паказывае, што ня хоча больш цярпець у сябе дома бальшавіцкай заразы, якая апрача клопату не дае больш ніякіх выгадаў.

Прыкладу Англіі наследуюць, безумоўна, і іншыя дзяржавы, якія маюць па ўшы клопату з бальшавізмам. У першую чаргу належыць чакаць перамены адносінаў да бальшавізму з боку Францыі, не бяз згоды якой Англія зрабіла адкрыты вызаў Маскве. Доказам гэтага служыць тое, што рашэньне Англіі разарваць адносіны з Радавай Расеяй наступіла безпасрэдня пасля візыты францускага прэзыдэнта і міністра Брыяна, з якім англійскія дзяржаўныя кіроўнікі безумоўна абгаварылі гэту справу. У зьвязку з гэтым і Польшча павінна перaглядзець свае адносіны да Масквы і падпарадкавацца новаму кірунку Заходня-Эўрапэйскай палітыкі ў адносінах да бальшавізму.


N.

Максім Багдановіч.

25 траўня г. г. споўнілася 10 гадоў, калі бязлітасная сьмерць унясла ў магілу нашага маладога, песьняра Максіма Багдановіча.

Максім Багдановіч, сын вясковага вучыцеля, радзіўся ў 1892 г. у Гродзеншчыне, але на Беларусі ён быў толькі да 2-х гадоў, і зусім маленькім хлопчыкам пераехаў у Ніжні-Ноўгарад, дзе бацька яго атрымаў нейкую пасаду.

Усё сваё жыцьцё М. Багдановіч пражыў звонку Беларусі, часамі наежджаючы сюды, ўжо будучы дарослым чалавекам. Такім чынам пачуцьцё да бацькаўшчыны ў яго душы абудзілася зусім іначэй, чым у Якуба Коласа, Янкі Купалы і іншых пісьменнікаў увросшых сярод роднага сярмяжнага люду і з малых



Максім Багдановіч (1892—1917 г.)

дзён быўшых пад уплывам яскравых малюнкаў праўдзівага народнага жыцьця.

М. Багдановіч знаў Беларусь больш праз кніжкі і размовы з бацькай, і гэта знацьцё памагло яму збудаваць у сваем зданьні нейкі зачараваны край, да якога і цягнуўся ён усей сваей песьнярскай душой. Па складу сваей прыроды, па напрамку сваей творчасьці Багдановіч надта розьніцца ад ўсіх наагул беларускіх пісьменнікаў Гэта песьняр чыстага харараства і хвілёвага ўражэньня. Дзеля таго, хто кахае форму верша, каму прыемна музыка слоў і чуласьць хвілёвых настрояў душы,—той заусёды будзе чытаць Багдановіча. Пажаль і гэты пісьменнік памёр без пары. Зьвялі яго ў раннюю магілу сухоты.

Летні вечар.

За лесам захаваўся
Чырвоны сонца круг.
Туман кругом разслаўся
На поля і на луг.
Апошні промык сонца
Растаяваў у мгле,
Здавалася бязконца
Пращчаньне сьвету шле.
Змрок цёмны апранае
Наш родны ругазор.
Ноч землю спавівае
Ў жалобны свой убор.
Над полем, над шырокім
Серп месяце узплыў,
Чырвоным сваім вокам
Абшар азалаціў.

Ул. Вецер.

Апошнія навіны.

За граніцай.

ЛЕТ ПРАЗ АТЛЯНТЫЧНЫ АКІЯН. 25 траўня Амэрыканскі лётнік Ліндберг пераляцеў на аэропляне з Амэрыкі да Парыжа.

ФРАНЦУСКІ ПРЭЗЫДЭНТ ДУМЭРГ У АНГЛІІ. 17 г. траўня французкі прэзыдэнт Думэрг выехаў да Лёндану. Па прыездзе ў Лёндан Думэрг злажыў візыту ангельскаму каралю, што як сьведчаць газэтты, выказала узмацненьне дружбы французка-ангельскай. Саправаджаў прэзыдэнта да Англіі франц. мін. замежных справаў Брыян. На банкеце ў Гвільд Толь прэзыдэнт Думэрг сказаў: дружба паміж Францыяй і Англіяй умацавалася досьледзінамі вялікай вайны. Утрыманьне супакою на сьвеце залежыць ад супольнай дзейнасьці Францыі і Анліі. Усе прыхільнікі супакою вельмі бы устрывожыліся каб пачулі, што дружба паміж гэтымі дзяржавамі стыгне. Дык вось Англія і Францыя павінны ў меру можнасьці супольна працаваць над усясьветным гаспадарча фінансавым адраджэньнем.

19 г. траўня прэзыдэнт Думэрг і міністар Брыян вярнуліся ў Парыж.

тэрыторыі Зах. Беларусі павінна ужывацца паралельна з мовай дзяржавай і мова беларуская.

§ 31. Самаўрадавыя установы ў сваіх мейсцовых справах павінны быць незалежнымі ад цэнтральнай улады.

§ 32. Бюджэт самаўрадавы пакрываецца часткай са сродкаў мяйсцавых, часткай з дзяржаўных.

§ 33. Да компэтэнцыі самаўрадаў належаць справы гаспадарчыя, школьныя, зямельныя, апека над хворымі, калекамі, беднымі і пацярпеўшымі ад вайны, а роўным чынам і справы адміністрацыйныя.

XX. С у д

§ 34. Суд павінен быць зусім незалежны.

§ 35. Павінны быць уведзены міравыя суды з выбранымі судзьямі і лаўнікамі.

§ 36. Павінены быць уведзены суды прысяжных для палітычных і найбольш важных угалоўных справаў.

§ 37. Палявыя (даразныя) суды павінны быць скасаваны

XXI. Работніцкае пытаньне.

§ 38. Б. Н. П., будзе бараніць усе здабычы работніцкай клясы як: васьмігадзінны рабочы деень на фабрыках, права забастовак, забарону начной працы прымусовай, забарону працы дзяцей меншых 16 гадоў, дзяржаўнага страхаваньня работнікаў гарадоў і вёсак ад хваробы, калецтва і г. д.

XXII. Палітычная і грамадзкая свабода.

§ 39 Усе грамадзяне зьяўляюцца роўнымі перад законам.

§ 40. Павінна быць свабода сходаў, слова друку і арганізацыяў усялякіх таварыстваў і профэсыянальных саюзаў.

XXIII. П а д а т к і.

§ 41. Б. Н. П., дамагаецца, каб быў уведзены толькі адзін гадавы падатак з разлажэньнем на раты і азначэньнем акрэсьленых наперад тэрмінаў плацяжоў.

§ 42 Падатак павінен вылічывацца залежна ад фактычнай даходнасьці грамадзяніна, прычым мерай агульнай зьяўляецца вартасьць маемасьці.

§ 43. Пасярэднія падаткі на прадметы першай необходнасьці (цукер, соль, газ і інш) павіны быць скасаваны.

§ 44. Даход які хапае толькі на пражыцьцё не павінен абкладывацца падаткам.

§ 45. Павінны быць скасаваны усялякія правы адміністрацыйнай улады на прымусовае сьцягаваньне падаткаў (інстытут сэквэстратараў).

§ 46. За падаткі ня могуць прадавацца забудаваньня, жывы і мёртвы інвэнтар і тыя прадукты, якія неабходны дзеля правядзеньня гаспадаркі і для пражыцьця не заплаціўшага падаткі.

XXIV. А д б у д о в а к р а ю.

§ 47. Б. Н. П. дамагаецца неадкладнай адбудовы тых зьнішчаных вайной гаспадарак, якія дагэтуль яшчэ неадбудаваны. Роўным чынам, каб усім ахвярам вайны была дадзена запамога.

Даклады з мест.

Даклад Т. Шыбута.

Пасьля кароткага перарыва пачаліся даклады з мейсц. Першым выступіў прадстаўнік Н. Б. Р. на Нясьвіжскі павет п. Т. Шыбут, падрабязна накрэсьліўшы настрой, патрэбы і імкненьня беларусаў у яго павеце.

Між іншым п. Шыбут зазначыў, што патрэбна вялікая праца, каб аздаравіць вёску ад рожных шкадлівых вонкавых і ўнутраных уплываў, якія заставіла па сабе Грамада. Але ужо, дзякуючы працы Б. Н. Р. і Т-ва „Прасьветы“ вёска пачынае выходзіць на здаровую нацыянальную дарогу. Лік прыхільнікаў гэтых арганізацыяў расьце з кожным днём. Пашыраецца культурная праца, арганізуюцца гурткі, якіх маецца ўжо 7. Наколькі вядзецца энэргічная праца ў гэтых гуртках, сьвядчыць Дунайчыцкі гурток, ў якім ў працягу двух гадоў яго істнаваньня адыгралася некалькі дзесяткаў спэктакляў.

Даклад У. Гарбуна.

Старшыня сэкрэтарыяту ў Дзятлаве У. Гарбун зазначыў вялікія зьмены, якія наступілі ў районе яго сэкрэтарыяту. Нядаўна яшчэ гэты район быў сплош грамадаўскі і энпэхоўскі. Сяньня ў гэтым районе ёсьць 195 сяброў і да 400 прыхільнікаў Б. Н. Р. і Т-ва „Прасьветы“. Гурткі Грамады яшчэ да яе ліквідацыі разваліваліся ўсюду там, дзе паўставалі нашыя арганізацыі. Культурная праца роўным чынам ідзе шпаркім ходам. Зарганізавана 14 гурткаў „Прасьветы“, пры якіх заложаны бібліётэкі, чытальні, а ў некатарых мяйсцох, як у Дзятлаве, аматорскія групы. З кожным днём пасьпех арганізацыі павялічываецца, хаця ў некатарых яшчэ мейсцох дробныя адміністрацыйныя і паліцэйскія улады перашкаджаюць у працы.

Потым адчыталі рэфэраты дэлегаты нашых мейсц і з кожнага рэфэрату можна было сконстатаваць, што ўсюды, ў адных мяйсцох мацней у другіх слабей, але ўсюды расьце і пашыраецца уплыў і праца Бел. Нац. Рады і „Прасьветы“.

Пасьля рэфэратаў з мейсц былі унесены старшынёй конфэрэнцыі ад імені Б. Н. Р. прапазыкі: або надаць Б. Н. Р. характар палітычнай партыі, або утварыць асобную партыю паводлуг палітычнай, праграмы, якая ў Б. Н. Радзе і якая ў аканчальнай форме мае быць прынята на конфэрэнцыі. Паслядыскузыі была аднагалосна прынята прапазыка утварэньня партыі пад назвай *Беларускай Нацыянальнай Партыі.*

Па падрабязным обгаворы, паасобных пунктаў праграмы, з папраўкамі праграма гэта была прынята ў форме, як падана вышэй.

Пасля гэтага пастаноўлена была выбраць цэнтральны камітэт новай партыі у ліку 13 сяброў з правам кооптацыі. Да прэзыдыюму увайшлі: старшыня А. Паўлюкевіч, віцэ старшыня М. Пятровіч і Я. Ярош, скарбнік Т. Вернікоўскі, сакрэтары: Кернажыцкі і Шыбко і сябры: Канапацкі, У. Гарбун, Т. Шыбут, М. Саковіч, Я Нехвядовіч, М. Абрамчык і М. Станкевічанка.

На гэтым конфэрэнцыя зачынілася.

Тутэйшая хроніка.

Агульны гадавы сход сяброу „Беларускае Хаткі“ у Вільні

У нядзелю 22 траўня г. г. ува ўласным памешканьні на Завальнай вул. № 6 адбыўся агульны гадавы сход сяброў Т-ва „Беларускае Хаткі“ ў Вільні Пасьля дакладаў Урада, рэвізыйнай комісіі і дыскусыі былі зроблены перавыбары Ўрада і Рэвізыйнай Комісіі. У склад новага Ўрада вайшлі: А. Паўлюкевіч—старшыня, Т. Вернікоўскі—скарбнік і Канапацкі — сакрэтар. У Рэвізыйную комісію выбраны: Я. Шыбка, В. Друцкі-Падбярэскі і М. Дыбоўскі.

Чэстн у Вільні. — 24 г. траўня знаміяніты ангельскі пісьменьнік Т. К. Чэстэртон з жонкай прыехаў у Вільню. На вакзале спаткалі яго прадстаўнікі ад ваяводзтва, Унівэрсытэту і Саюзу літэратаў польскіх. Прывітаў гасьцей праф. Сташэўскі гутарачы у мове ангельскай.

Выбар у Местовую Раду у Варшаве.

Новая Месцовая Рада складаецца з 47 родных гаспадарскага камітэту абароны польскасьці Варшавы. 27 радных Р.Р.С. 15 радных жыдоўскага народнага блёку. 7 радных „Бунду“ 3 радныя жыдоўскага саюзу „Поалей-Сыён“ 2 радныя польскага саюзу работніцкага.

УСЯЧЫНА.

Б'юць комуністау.

20 м. красавіка ўначы ў Пецярбургу на рагу Сярэдняга Прасьпекта і 3-яй лініі Вас. Острава няведамыя асобы напалі на групу партыйных работнікаў, якія варочаліся з паседжньня Васіле-астроўскага райкома. Нападаючыя пабілі комуністаў і ўцяклі, захапіўшы іх дакумэнты.

Адкрыцьце бацылы трахомы.

Як паведамляюць, Японскі бактэріолёг Гідэва Ногухі выкрыў бацылу трахомы, хваробы надта заразьлівай, каторая ў асобеннасьці на ўсходзе часта зусім асьляпляе.

Золата на Полесьею.

Праф. Моразовіч, д-р Кузьмяк, д-р Манкоўскі выехалі 18 г. траўня з Варшавы да Луненца з мэтаи зрабіць дасьледзіны ў справе капальняў волата на Палесю.

Пашырайце роднае слова!

З Усходняй Бел.

Сын мсьціць за сьмерць бацькі і забівае савецкаго камісара.

З Ташкенту даносяць, што там на вагзале некалькімі выстраламі з рэвальвэра забілі члена палітычнаго бюро Узбекістанскай комуністычнай партыі Анішэва Забойца стрэліў два разы да Анішэва і забіў яго на мейсцы, а п тым і сам застрэліўся Сьледства выясьніла, што забойцам тым быў нейкі Аншыбэк, сын тамашняга жыхара, растрэлянага ў сваім часе па загаду Анішэва.

Ураган.

Ураган, які ў апошнім часе шалеў на абшары Заходняй Беларусі прайшоў на Беларусь Усходнюю і нарабіў шмат шкоды. На адрэзку чугункі паміж Менскам і Гомлем узьнялася такая сільная бура, што трэба было затрымаць чугуначны рух на некалькі гадзінаў. Вывараченыя дрэвы і тэлеграфныя слупы завалілі чугуначны тор.

На 23 кілёмэтры ад Менска вецер перавярнуў будку Будачнік разам з жонкай і двумя дзяцьмі быўзабіты на мейсцы. Уратаваўся толькі старшы яго сын, 17-гадовы дзяцюк. Паводле аблічэньняў з афіцыяльных савецкіх крыніцаў лік ахвяраў даходзе да 25 асобаў забітых і раненых.

Жыцьце провіцыі.

Не удалося.

Гэтак Званы „Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры“ спыніў сваю дзейнасьць у справе вербаваньня маладых хлопцоў на выезд да Паўночнай Амэрыкі Амэрыканскі урад, як і трэба было чакаць, адказаўся прыймаць збальшавізаваную мол дзь у свой край Паводле другіх вестак гэны „Інстытут“ хацеў перавясьці ў Амэрыку зліклівідаваную у чэхах агітацыённую пляцоўку.

Бальшавіцкая зараза.

(*Пружаншчына*)

Ужо ня раз пісалася, што Сель-саюз Ярэміча і Рагулі ўва ўсім унасьледаваў тактыку нябошчыцы гнілой памяці комуністычнай „Грамады“. Доказаў гэтаму аж за шмат. Найярчэйшымі з іх ёсьць тые, што ўсе былыя дзеячы, платныя агенты „Грамады“ перавярнуліся раптам у дзеячаў — агентаў (ну і пэўня-ж ня дармавых Сель-саюзу.

Ведомы ў нашай ваколіцы былы камуністычна-грамадаўскі платны агент Гмыр Уладзімер сел. з в. Сашыцы, Селецкае гміны, адсядзеўшы ў Пружанскім вастрэзе два месяцы і па звальненьню (мне здаецца ня па чыстаму—але аб гэтым пасля)няэнайшоўшы ў жывых здохлае Грамады,– стаў раптам заядлым паклоньнікам Ярэміча і Рагулі.

У кожны нумар новае бальшавіцкае воргану „Сялянскае Ніва“ ён пасылае свае брахні — корэспондэнцыі пад псўдонімамі, зьменнымі, як яго і ягоных кумпаноў скура, як „Сашыцкі“ „Полымя“ і ў апошнія часы „Оса“. У сваіх корэспондэнцыях ён аблівае брудам ўсё тое і ўсіх тых хто ня ў ягоную дудку грае.

Дзякаваць аднак Богу гэтак шкодных для сялянства элемэнтаў у нашай ваколіцы больш няма. А бальшавіцкі платны агэнт Гмыр ужо пагрыз два месяцы вастрожную рашотку,—дачакаецца пагрызе і болі але... каб часам ня паламаў ўжо на ёй зубы.

Іржа

Па сьвеце.

Найвялікшыя гарады на сьвеце.

Перэд вайной найвялікшым горадам на сьвеце быў Лёндан, а цяпер ў наступнай чарзе стаяць гарады па сваей велічыне: 1) Нью Іорк — 9 мільёнаў 350 тысяч жыхароў, 2) Лёндан — 7 мільён. 660 тыс, Па рыж — 4 мільён 600 тыс., 4) Бэрлін — 4 м. 26 т., 5) Чыкага — 3 м. 600 т., 6) Філадэльфія — 2 м. 700 т. 7) Буэнос-Айрэс — 2 м. 500 т, 8) Осака — 2 м., 115 т, 9) Масква — 2 м. 18 т., 10) Шанхай — 2 м. 11 т., 11) Токіо — 1 м. 995 т., 12) Вена — м. 900 т. (перад вайною Вена займала сёмае мейсца на сьвеце па сваей велічыне), 13) Бастон — 1м. 900 14) Петраград — 1 м. 611 т. (гэтак сама пасьля бальшавіцкай рэвалюцыі зна іна зьменшыўся), 15) Дэтруа — 1 м. 550 т, 16) Гамбург — 1 м. 510 т., 17) Пэкін - м. 500 т, 18) Ханькоў (дзе цяпер знаходзіцца сядзіба кантонскага чырвона-комуністычнага ўраду)— 1 м. 500 т., 19) Рыо-дэ-Жанэйро — 1 м. 442 т. 20) Калькутта — 1 м. 400 т.. 21) Пітсбург — 1 м. 300 т., 22) Бомбэй – 1 м. 250 т., 23) Будапэшт — 1 м. 235 т. 24) Лівэрнур — 1 м. 232 т., 25) Бірлінгам — 1 м 210 т, 26) Афіны — 1 м. 150 т., 27) Глазго — 1 м. 128 т.. 28) Кліўмянд — 1 м. 100 т., 29) Лос Ангелос — 1 м. 100 т., 30) Банкоп — 1 м. 70 т 31) Манчэстэр — 1 м. 62 т., 32) Сіднэй — 1 м. 60 т, 33) Варшава — 1 м. 50 т. 34) С.-Луі — 1 м. 24 т. Па мільёну маюць: Мэксіка, С-Францыско, Кантон Сіангтон і Неапаль.

Раскопкі даўнага рымскага места Гэркулянума.

17 г траўня блізк Неаполя (у Італіі) пачалі раскапываць старое рымскае места Гэркулянум. Пры урачыстым залажэньню раскопак быў прысутны сам італьянскі Кароль Віктар Эман іл, а таксама шмат хто з прадстаўнікоў палітычнага літэратурнага і артыстычнага сьвета.

Паштовая скрынка.

Янку А. з Радашковіч. —Гурток „Прасьветы“ раб це. Просьбу Вашую споўнім.

Шаху у Баранавічах, сябру „Прасьветы“. Вашы вершы будуць надрукаваны ў наступным нумары

Біржа.

Даляры	8,94—8,90 зл.
Рублі зал.	4,60 зл.
Рублі сяр.	2,72 зл.
Чырвонцы	32,75 зл.

Збожжа

(*Варшава*)

Жыта (100 кілагр -6 пудоў)	55—56 зл.
Пшаніца „ „	, 64 зл.
Ячмень брав	49—50 зл.
Ячмень крупяны	51—53 зл.
Авёс „ „	37—50 зл.

(*Віленшчына*)

Жыта (100 кілагр.)	49—53, зл.
Пшаніца „ „	60—63, зл.
Ячмень браваровы	46—50, зл.
Ячмень крупяны	48 - 50, зл.
Авёс „	45—47, зл.

КЛЕД ФАРЭР.

Найбольшая

(Тлумачэньня з францускага Л. М).

Сваей матцы.

Калі яна мела сем гадоў, яна ужо выявіла свой характэр—нічога не баяцца, саўсім нічога. Быў неяк маленькі сабачка грыз ён сваю костку ля тратуару. Наскочыў большы, піхнуў малога і адабраў яго здабычу. Не палічыў вялікі на госьця, што быў у малога. Яна была недалёка, узяла вялікага собаку за вуха ацягнула яго назад, моцна пацягнула, падняла костку і вярнула малому. Потым стаяла проста і адважна паміж вялікім сабакам і малым. Вялікі сабака быў так здзіўлены, што ня спраціўляўся, спершa. Бітва была выграна. Ах! Далей пайшло не так добра. Раззлаваўшыся вялікі сабака, як толькі ачуціўся ад страху, кінуўся наперад і хваціў клыкамі малую, далікатную, тлусьценькую дзяўчынку, укусіў так моцна ажно кроў, як вода з мачалкі, пацякла. Скора на зямлі паказалася вялікая, крывавая пляма. І сямігадовае дзіця крычэла, але ня кінулася уцякаць, ані на адзін крок не саступіла. Стаяла на адным мейсцы паміж імі, як той камень на мяжы—паміж малым зьвяром пакрыўджаным і вялікім ашалелым. Не уступала, нібы прырасла на мейсцы пакуль людзі не прыляцелі з кіямі і пугамі.

Добра пачынала. І ніхто ня зьдзівіўся, калі дванаццаць—пятнаццаць гадоў пазьней, ідучы за сваім унутраным пазывам яна выйшла замуж за салдата. Праўдзівага. Быў гэта капітан калёніяльнай інфантэрыі. Аднак ён не ажаніўся аж пакуль ня завёз сваю будучую жонку як мог далей, у Габон, у Сэнегаль. Але гэта яшчэ было нічога.

Бяда вось была ў тым, што ён дастаў кулю ў жывот у бітве пад Казамэнай. Арднас знайшоў яго цяжка раненага, прынёс.

Паведамілі яе, як належа, з вялікай засьцярогай.

— Вы ведаеце... Яго зачапіла... але злёгка, саўсім лёгка..

Яна перабіла падаўцаў свянцонай вады.

— Смерць?

Запярэчылі.

— Але-ж саўсім не! Пастойце, вось ён... Глядзіце-ж...

Яна узглянула. Ен быў бляды як воск, вочы закрытыя, шчокі упалыя. Дагадлівы хірург палічыў, што трэба паясьніць.

— Пані, рана знаходзіцца трохі вышэй.. ампутацыя сапраўды немагчыма.

Яна зьмерыла яго вачыма.

— Немагчыма? Я надзеюся! Я хачу, каб вы мне уратавалі яго з двумя нагамі.

Уратаваў.

Толькі праз нейкую шасьцёрку гадоў пазней мелі яны добрага хлопца здаровага, вясёлага. І натуральна яна як і ён, мужык і жонка, матка і бацька проста кланяліся яму. Наведалася ў іх аколіцу тыфозная гарачка, і балаўніка забрала. Не дасьмеху. Занадта. Пазвалі доктара, найлепшага.

— О... кажа ён, вось трудна!

— Доктар, кажа яна, зрабіце усё што можыце. Зрабіў як мог. Балаўнік сагнуўся падняўся, зноў апусьціўся. Памёр.

— Доктар, кажа яна, дзякую, усё роўна. Зрабілі вы ўсё тое, што можна было зрабіць. Вось мелі яны другога сына, малодшага шасьцю гадамі.

Ніхто ня ведае, можа быў гэта той, хто піша гэтую гісторыю.

І шэсьць гадоў пазьней таксама злёг ён у пасьцель. Тыфозная гарачка Зноў матка пазвала доктара, таго самага.

Гутарылі:

— Але ж давёў ён ужо да сьмерці старшага

Яна адказала:

— Бог яго мне даў,

Бог мне яго узяў.

Бог даў мне і гэтага, а можа ня возьме яго, міласьць Яго без канца.

Зьявіўся доктар, той самы.

Сказаў ён ізноў, як ужо гаворыў.

— О.. вось трудна.

Балавень парушыўся, падняўся, апусьціўся.

Доктар, як мог стараўся. На лепшае, хлапчук не памёр.

І матка, якая сядзела пры ім трыццаць дзён не змыкаючы вачэй ані на гадзіну, ўздыхала ад радасьці, калі відзела як ён папраўляўся.

— Бог яго мне даў, Бог яго мне пакінуў

Можа бы другі доктар не стараўся так каля хворага.

Потым прайшлі гады, памёр сваей чаргой мужык. Паўмералі дзеці. Не асталося нікога болі, як толькі яна і тое яе дзіця, якое напісала гэту гісторыю.

Апошні яе сын стаў салдатам, Яна, жонка салдата, стала маткай салдата.

Нічога не баяцца.

Прайшлі гады, ей стукнула семдзесят. Была яна таксама статная, здаровая. Сын яе салдат быў у брэскім гарнізоне. Брэст места, дзе ў дамох на сходы не праходзе сьвятло ні праз вокны ў сьценах ні праз дах І цёмна там, як у пеклі нэграў.

Посьля абеда яе сын салдат пайшоў на службу. Яна, як належала, сабралася ў царкву, маліцца за яго. Інакш яна не малілася як толькі за другіх. За сябе маліцца, на што? Былі-бы гэта малітвы непатрэбныя. Было, можа, тры гадзіны па палудню. За дзьвярмі была такая цемра, што не сьвятлей было як у трэцяй гадзіне ночы.

Яна адчыніла дзьверы на сходы і два разы ступіла, шукаючы паручы. Зачапіла нейкую нязвыклую рэч. Стала мацаць абоіма рукамі і пазнала. Быў гэта вісельнік. Бедны работнік, без працы, ня змог ніч га лепшага знайсьці як пайсьці і павесіцца, на сходах, перад дзьвярмі.

Памацала і дагадалася што рабіць. Я праўду магу сказаць, што ня ведаю, што-б вы зрабілі на яе мейсцы. Я сам таксама ня ведаю, што-б я мог зрабіць. Але яна, яна ня вагалася. Трохі прысела, абхапіла рукамі вісельніка, падняла уверх каб аслабіць вяроўку, дый дзяржала яго так; і вось тады, тады толькі закрычэла

— Ратуйце! Сюды!

Прыляцелі. Адчапілі вісельніка. Ён яшчэ дыхаў. Уратавалі з пекла, у якім ён ужо захліпаўся.

Трэба сказаць, што яна яго саўсім адратавала Я забыўся вам сказаць, што яна была вельмі бедная: ані воднага су. Вось знайшла грошы, каб даць вісельніку. Няхай другі раз не акаяіцца і знойдзе смак у жыцьці. А сама жыла таксама далей. Я ужо сказаў, шчо яна нічога ня мела пры сабе. Была гэта жонка салдата, матка салдата, таксама Найбольшая.

Мая матка..

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.